Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.

№ 37 (689) • Пятніца 15 снежня 1967 г. • Цана 2 кап. Год выдання XXI

## ДА СЕСІІ засталося 18 дзён ДАРАЖЫЦЕ ЧАСАМ!

## КАБ НЕ БЫЛО НЕЧАКАНАСЦЕЙ

Заканчваецца ўжо апошні месяц вучобы ў гэтым семестры. Падыходзяць да канца лекцыі, засталося правесці лічаныя практычныя ці семінарскія заняткі. І хоць заключны вынік работы ўсяго калектыва падводзіць сесія, але ўжо цяпер можна ў некаторай ступені судзіць аб адносінах студэнтаў да вучобы па тых ці іншых прадметах, аб магчымых перспектывах здачы імі экзаменаў за семестр. Гэта тым больш паспяхова могуць зрабіць тыя выкладчыкі, якія самі вядуць як лекцыі, так і практычныя заняткі і, вядома, больш часта сустракаюцца са студэнтамі.

Я чытаю лекцыі па гісторыі КПСС на першым курсе аддзялення радыёфізікі і сам вяду семінарскія заняткі ва ўсіх пяці групах гэтага патоку. Акрамя гэтага, амаль з кожным студэнтам гутарыў па зместу пройдзеных матэрыялаў, назначаў у групах залікі па тых ці іншых тэмах. Усё гэта дае магчымасць ужо цяпер судзіць аб якасці засваення праграмнага матэрыялу і прымаць неабходныя меры, якія дапамагаюць студэнтам-першакурснікам увайсці ў каляю і рытм жыцця вышэйшай школы.

Якія ж у цэлым уражанні па выніках прайшоўшых заняткаў і індывідуальных гутарак са студэнтамі?

Перш за ўсё, значная розніца ў адносінах да вучобы, у падрыхтоўцы да заняткаў. Часта ў адной і той жа групе адны студэнты па меры праходжання вучэбнага матэрыялу адразу працуюць над яго засваеннем, а іншыя адкладваюць гэтую падрыхтоўку да экзаменаў. У выніку, нават матэрыял, які лёгка засвоіць, прачытаўшы некалькі старонак рэкамендаванага тэксту, для нядбайных будзе здавацца цяжкім. Такія студэнты, вядома, патрабуюць сістэматычнага кантролю, які могуць і павінны праводзіць камсамольскія арганізацыі груп і курсаў.

Кідаюцца ў вочы даволі нястрыманыя паводзіны некаторых студэнтаў на занятках: на лекцыі яны часта з'яўляюцца з папулярнымі часопісамі, а на семінарскіх перапісваюць канспекты гэтых лекцый у сваіх суседзяў. Вядома ж, першыя экзамены з'явяцца для такіх студэнтаў значным узрушэннем. Але будзе вельмі шкада, калі яно стане для іх даволі балючым... І тут жа камсамольскія арганізацыі змаглі б многае зрабіць.

Але ўсё ж большасць студэнтаў першага курса аддзялення радыёфізікі сур'ёзна адносіцца да вучобы. Прайшоўшыя ва ўсіх групах грунтоўныя размовы па некаторых пройдзеных тэмах і меры, прынятыя пасля гэтых гутарак, даюць падставы лічыць, што большасць студэнтаў свае першыя экзамены здасць паспяхова.

**Г. ГЕРАСІМЕНКА,**
кандыдат гістарычных навук.



*Ідуць апошнія ў гэтым семестры практычныя заняткі, на якіх студэнты паказваюць сваю дасведчанасць па тых ці іншых пытаннях. Асабліва «горача» на занятках у матэматыкаў. Перад іх вачыма нараджаюцца новыя доказы тэарэм, розныя спосабы рашэння задач.*

*НА ЗДЫМКУ: студэнт другога курса матфака У. НОДЗЕЛЬМАН рашае задачу па матэматычнаму аналізу.*

*Фота І. АСКІРКІ.*

## ВЫСОКА НЕСЦІ СЦЯГ НАВУКІ!

Нядаўна ва універсітэце экспанавалася вельмі цікавая выстаўка — кнігі, брашуры, манаграфіі — працы выкладчыкаў і аспірантаў. Сабраныя разам, гэтыя кнігі склалі даволі вялікую бібліятэку па самых розных галінах ведаў. На стэндах, якія занялі адну з аўдыторый, былі змешчаны навуковыя працы па гісторыі, філасофіі, матэматыцы, фізіцы, біялогіі, глебазнаўству, мовазнаўству і многа іншых. Больш 10 тысяч назваў утрымлівае картатэка творчай прадукцыі універсітэцкіх аўтараў.

Гэтая выстаўка многае расказала не толькі гасцям універсітэта, але і яго выхаванцам-студэнтам аб той вялікай плённай навуковай рабоце, якую вядуць выкладчыкі — вучоныя і педагогі.

Не выпадкова вучэбная і навуковая работа была ў цэнтры ўвагі справаздачна-выбарчага партыйнага сходу, які адбыўся нядаўна ва універсітэце.

Сакратар парткома **Т. Я. Дударава** ахарактарызавала дзейнасць партыйнай арганізацыі ў юбілейным годзе Савецкай улады. Увага ўсіх камуністаў была сканцэнтравана на падрыхтоўцы спецыялістаў адпаведна патрабаванням сучаснага жыцця. З гэтай мэтай удасканальваліся вучэбныя планы і праграмы, перагледжан змест многіх лекцый, створаны новыя вучэбныя дапаможнікі. Больш аператыўна ўключаліся ў навучальны працэс вынікі навуковых даследаванняў. Для адбору

*(Заканчэнне на 2-й стар.).*

## Без скідкі на спецыфіку

Вядома, што на вячэрнім аддзяленні займацца цяжэй, чым на стацыянары. Гэта ўлічваюць і выкладчыкі, і многія студэнты. Але дрэнна, калі некаторыя студэнты апраўдваюць свае нядбайныя адносіны да вучобы спецыфікай. Цяпер, напярэдадні сесіі, часта можна пачуць ад саміх вячэрнікаў, што патрабавальнасць выкладчыкаў да іх павінна быць больш мяккай. Гэта памылковая думка. Той, хто выбраў сабе будучую прафесію па душы, старанна адносіцца да заняткаў, сістэматычна працуе над сабой, заўсёды паказвае глыбокія веды. Але ж аб якіх трывалых ведах студэнтаў трэцяга курса геолага-геаграфічнага факультэта Гуранкова, Гарнастая, Кандрацюка, Глошкінай і Гольдзінай можа марыць выкладчык, калі яны прапусцілі больш палавіны семінарскіх заняткаў па палітэканоміі. Ды і на тых, на якіх прысутнічалі, не ўдзельнічалі ў абмеркаванні праграмных пытанняў тэмы. У цэлым на гэтым курсе з 574 чалавека-гадзін семінарскіх заняткаў прапушчана 182. Трывожнае становішча. Канешне, і дэкан факультэта В. А. Рамаными, і грамадскія арганізацыі рабілі захады для таго, каб умацаваць дысцыпліну. На многіх падзейнічалі гутаркі і папярэджанні. Так, цяпер менш пропускаў у першай групе; высокую актыўнасць на занятках праяўляюць студэнты Зянкевіч, Пацук і іншыя. Прыемна, што многія за апошні час змаглі падцягнуцца ў працы над першакрыніцамі, заканспектавалі асноўныя работы, рэкамендаваныя вучэбным планам. Цяпер для многіх стала зразумелым, што было б лепш, каб яны сістэматычна рыхтаваліся да семінарскіх.

А вось аб другой групе гэтага не скажаш. За выключэннем некалькіх студэнтаў, усе астатнія, як правіла, павярхоўна рыхтуюцца да заняткаў, пасіўнічаюць на семінарах, і з упэўненасцю можна сказаць, што экзамены ім здаць будзе вельмі цяжка. Пры ўсіх сваіх намаганнях яны ўжо не змогуць нагнаць прапушчанае, узнавіць веды па такому вялікаму курсу, як палітэканомія. А экзамен будзе праводзіцца без ніякай скідкі на спецыфіку вячэрняга навучання. Патрэбны веды.

**М. БАЗЫЛЕЎ,**
выкладчык кафедры палітэканоміі.

## МЕРА АДКАЗНАСЦІ

Звыш чатырох тысяч студэнтаў і выкладчыкаў нашага універсітэта з'яўляюцца членамі ДТСААФ. Яны актыўна ўдзельнічаюць у 40 абаронных секцыях і гуртках. Тут пад кіраўніцтвам вопытных выкладчыкаў, былых воінаў, афіцэраў запаса юнакі і дзяўчаты авалодваюць разнастайнымі спецыяльнасцямі. У горадзе вядомы універсітэцкія парашутысты, аўтамабілісты, матацыклісты, веславальшчыкі і іншыя аматары спорту, што культывіруюцца ў арганізацыях ДТСААФ. Аднак абаронна-масавая работа не абмяжоўваецца дзейнасцю гурткоў і секцый, у ёй усё большае месца займаюць такія мерапрыемствы, як паходы па месцах баявой і рэвалюцыйнай славы, сустрэчы з ветэранамі войнаў, ваенізіраваныя гульні і спаборніцтвы.

Аб усім гэтым падрабязна гаварылася на канферэнцыі членаў ДТСААФ універсітэта.

Са справаздачным дакладам выступіў старшыня камітэта М. Бондар. Ён адзначыў, што нядаўныя рашэнні партыі і ўрада аб вайсковай павіннасці і мерах па далейшаму развіццю абаронна-масавай работы ў краіне дапамаглі нашай арганізацыі дасягнуць новага зруху ў пастаноўцы ваенна-патрыятычнага выхавання студэнтаў. Асноўная ўвага цяпер звернута на авалоданне ваеннымі спецыяльнасцямі, больш поўную фізічную і ідэйную загартоўку.

Вялікую цікавасць выклікалі спаборніцтвы па начному і тапаграфічнаму арыентаванню, пераадоленню перашкод, а таксама шлюпачныя паходы па Беразіне, Прыпяці. Толькі ў гэтым годзе ў стралковай секцыі падрыхтавана 18 спартсменаў першага і другога разраду, 105 трэцяга. Многія з іх абаранялі гонар універсітэта на адказных спаборніцтвах, і, у прыватнасці, нашы стралкі занялі першае месца ў Ленінскім раёне. Павышэнню іх майстэрства садзейнічала тое, што за апошні час ва універсітэце было праведзена 16 спаборніцтваў паміж стралкамі факультэтаў. Выявілася, што мацнейшыя стралкі — на хімічным факультэце. За імі ідуць фізікі і матэматыкі.

Але і дакладчык, і выступіўшыя ў спрэчках дэлегаты, у прыватнасці, член зборнай каманды тав. Скайзін, выказалі занепакоенасць, што ва універсітэце слаба рыхтуецца замена вядучым спартсменам. Праз год тры чвэрці зборнай па стралковаму спорту закончаць вучобу і пакінуць сцены універсітэта. Трэба, каб за гэты час яны паспелі перадаць свой вопыт малодшым таварышам.

Кіраўнік аўта-мотасекцыі тав. Новаш і іншыя дэлегаты падрабязна гаварылі аб тым, што яшчэ не ўсе гурткі маюць неабходную матэрыяльную базу, і гэта адмоўна ўплывае на арганізацыю ваенна-патрыятычнага выхавання. Праўда, калі на чале гуртка або секцыі стаіць ініцыятыўны чалавек, ён зможа знайсці выхад нават з самага цяжкага становішча. У якасці прыкладу на канферэнцыі называлі Віктара Озерава — студэнта факультэта журналістыкі. Былы воін, ён у 1964 годзе арганізаваў парашутную секцыю, якой кіруе на грамадскіх пачатках. Толькі за апошні час тут прайшло тэарэтычную падрыхтоўку звыш 100 юнакоў і дзяўчат і 40 з іх маюць ужо на сваім падліку па два і больш скачкоў з парашутам. Член секцыі Люда Кукчанка, акрамя гэтага, займаецца пры Рэспубліканскім доме ДТСААФ. І такіх прыкладаў можна прывесці многа. Слушна гаварыў старшыня Ленінскага райкома ДТСААФ А. Сідарэнка, што універсітэцкая арганізацыя значна палепшыць свае поспехі, калі будзе больш абапірацца на ініцыятыву такіх людзей, як Віктар Озераў, на дапамогу афіцэраў запаса, выкладчыкаў кафедры фізвыхавання і спорту.

Разам з тым неабходна больш сур'ёзная патрабавальнасць да факультэцкіх кіраўнікоў ДТСААФ. Пры падвядзенні вынікаў работы, аказалася, што апошняе месца занялі філолагі. Інакш і не магло быць, таму што кіраўнік факультэцкай арганізацыі ДТСААФ А. Скварцоў дрэнна выконваў свае абавязкі.

Прааналізаваўшы гэтыя і іншыя факты, канферэнцыя вызначыла цікавыя мерапрыемствы па арганізацыі месячніка абаронна-масавай работы, прысвечанага 50-годдзю Савецкай Арміі. Ён будзе праводзіцца ў студзені-лютым 1968 года. На канферэнцыі быў зачытан прыказ аб узнагароджанні лепшых членаў ДТСААФ граматамі, каштоўнымі падарункамі, а кіраўнікам факультэцкіх арганізацый уручаны дыпломы за перамогі ў спаборніцтвах.

**А. КАЛАНТАЙ,**
старшыня камітэта ДТСААФ факультэта журналістыкі.

## НА ПАДРЫХТОЎЧЫМ ФАКУЛЬТЭЦЕ

# ЛАЎРЭАТЫ

**У канцы лістапада адбыўся заключны канцэрт Усесаюзнага інтэрнацыянальнага студэнцкага фестывалю самадзейнага мастацтва.**

**Галоўная задача фестывалю складалася ў тым, каб шырэй прыцягваць замежных студэнтаў, што вучацца ў СССР, да ўдзелу ў канцэртах мастацкай самадзейнасці, садзейнічаць далейшаму ўмацаванню дружбы паміж замежнымі грамадзянамі і савецкімі людзьмі, павышаць ідэйна-мастацкі ўзровень творчых студэнцкіх калектываў.**

**На фестываль у Маскву з Ленінграда, Кіева, Адэсы, Харкава, Баку і іншых гарадоў сабралася звыш 200 замежных студэнтаў, якія прадстаўлялі звыш 40 краін свету.**

**З Беларусі на заключны канцэрт фестывалю быў запрошаны танцавальны калектыў в'етнамскіх студэнтаў, якія вучацца ва універсітэце.**

**З вялікім уздымам самадзейныя артысты рыхтавалі свой народны нацыянальны танец «Цям Ронг» (танец з веерамі), які сімвалізуе адпачынак пасля работы.**

**У Маскве наш танцавальны ансамбль, якому акампаніраваў студэнт першага курса фізфака Хо Нгок Чонг, выступаў у Доме дружбы, ва Узорнай друкарні імя Ждана, Агенцтве друку Навіны, у Цэнтральным доме літаратара.**

**Усесаюзнае журы, у складзе якога былі вядомыя дзеячы мастацтва, такія, як І. Ільінскі, З. Фёдарава, М. Рэйзін, высока ацанілі самадзейнае мастацтва танцавальнага ансамбля. Аб гэтым сведчыць Дыплом I ступені і званне лаўрэатаў.**

**Наша вялікае пажаданне замежным студэнтам — яшчэ актыўней удзельнічаць у мастацкай самадзейнасці, дабівацца такіх жа поспехаў і ў астатніх жанрах мастацтва.**

**Ц. СТАРЧАНКА.**

***

⊙ *Удзельнікі мастацкай самадзейнасці пачалі рыхтавацца да свята 50-годдзя Савецкай Арміі і Ваенна-Марскога Флота.*

*На факультэце працуюць харавы і танцавальны калектывы. Рыхтуюцца да канцэртаў салісты і майстры мастацкага чытання. У іх рэпертуары як нацыянальныя в'етнамскія песні і танцы, так і рускія народныя, а таксама сучасныя песні беларускіх кампазітараў.*

⊙ *На днях дацэнт Г. А. Павеццей прачытаў для в'етнамскіх студэнтаў лекцыю аб працоўным заканадаўстве ў СССР.*

⊙ *Выйшаў чарговы нумар насценгазеты «Веды», што выпускае кафедра прыродазнаўчых дысцыплін. У ім змешчана шмат цікавых матэрыялаў.*

⊙ *Зайтра ў памяшканні БПІ адбудзецца гарадскі студэнцкі вечар, прысвечаны Дню Нацыянальнага Фронта вызвалення Паўднёвага В'етнама. У ім прымуць удзел в'етнамскія і савецкія студэнты універсітэта.*





# ВЫСОКА НЕСЦІ СЦЯГ НАВУКІ!

(Працяг. Пач. на 1-й стар.)

навуковай інфармацыі прыцягнуты вядучыя вучоныя універсітэта і інжынерна-тэхнічныя работнікі вытворчасці, многія канструктарскія бюро і інстытуты АН БССР. Вынікі адбору навуковай інфармацыі разглядаліся саветамі факультэтаў і метадычнымі камісіямі. Гэта дапамагло ўстанавіць пераемнасць дысцыплін, пазбегнуць паралелізма і дубліравання.

Актывізавалі метадычную работу кафедры універсітэта. Распрацаваны праграмы многіх спецкурсаў, вытворчых практык. У навучальным працэсе шырэй выкарыстоўваліся тэхнічныя сродкі навучання. У мінулым годзе было паказана 465 навуковых кінафільмаў. На некаторых кафедрах практыкаваліся заняткі з дапамогай навучальных машын, рабіліся гуказапісы лекцый.

І ўсё ж якасць падрыхтоўкі маладых спецыялістаў у асноўным залежыць ад узроўню выкладання. Таму рэктарат, партком, дэканаты і партыйныя арганізацыі больш увагі ўдзяляюць навуковаму і палітычнаму росту выкладчыцкіх кадраў. Значная частка выкладчыкаў павышае кваліфікацыю ў аспірантуры і дактарантуры, паспяхова абараняе кандыдацкія і доктарскія дысертацыі. Так, у мінулым годзе дактарамі навук сталі тт. Барысаглебскі, Ткачоў, Цішчанка, Левін, Жураў, Авакаў, Курылёў, Багданаў. Паспяхова працуюць над доктарскімі дысертацыямі тт. Філімонаў, Жмуроўскі, Малашка, Матвеенка, Драбязка, Юркевіч і іншыя. Кандыдацкія дысертацыі абаранілі 35 выкладчыкаў.

Значна павялічыўся ўзровень навуковай работы. Больш актуальнай стала тэматыка даследаванняў, з'явілася больш друкаванай прадукцыі. Былі прадстаўлены на разгляд 12 аўтарскіх работ, выйшлі з друку — 600 навуковых прац. Навуковыя даследаванні больш адпавядаюць патрабаванням вытворчасці. Паспяхова закончана распрацоўка новых методык на кафедры электрафізікі, якую ўзначальвае член-карэспандэнт АН БССР У. Г. Вафіядзі. Кафедрай фізічнай оптыкі распрацавана методыка прыбораў для кантролю марак бітума. Для Беларускага інстытута пладагародніны і бульбы кафедра спектральнага аналізу распрацавала і падрыхтавала прыбор для аўтаматычнай рэгістрацыі асвятлення і тэмпературы ў палявых умовах.

Калектыў кафедры беспазваночных жывёл біялагічнага факультэта разам з Інстытутам рыбнай гаспадаркі БССР распрацаваў рэкамендацыі для Віцебскай і Нарачанскай рыбных гаспадарак.

Адчувальны поспехі навукова-даследчай працы на геолага-геаграфічным факультэце і кафедрах грамадскіх навук.

Вядучыя вучоныя універсітэта прымалі ўдзел у міжнародных сімпозіумах і канферэнцыях у Лондане, Парыжы, Берліне, Будапешце, Бухарэсце і іншых гарадах.

Сярод недахопаў навуковай працы Т. Я. Дударава вызначыла галоўныя: мнагатэм'е, адсутнасць комплекснай тэматыкі, недастатковы кантроль за навуковай працай кожнага выкладчыка.

Выступаючы ў спрэчках па дакладу, многія камуністы выказалі шэраг заўваг і прапаноў, што датычацца пастаноўкі вучэбнай і навуковай працы.

Сакратар партбюро біялагічнага факультэта **А. В. Царук** падкрэсліў узрослую ролю навуковых даследаванняў і большую патрабавальнасць да выкладчыкаў і студэнтаў. Сцяг навукі павінны несці вучоныя як старэйшага пакалення, так і малодшага, выпускнікі універсітэта. Навуковыя супрацоўнікі факультэта добра гэта разумеюць і не толькі самі плённа працуюць, але і прыцягваюць да навуковых даследаванняў студэнтаў.

Асобная ўвага ўдзелена распрацоўцы вучэбных планаў і падручнікаў. Каштоўныя працы выданы прафесарамі А. У. Канстанцінавым, П. Ф. Ракіцкім і іншымі выкладчыкамі. Кожны сёмы выпускнік факультэта стаў кандыдатам навук. На факультэце працуюць 14 дактароў навук і 44 кандыдаты. І ў той жа час, як адзначыў гав. Царук, па некаторых галінах адчуваецца недахоп вучоных. Адмоўна ўплывае на навуковую працу недахоп патрэбнага абсталявання, адсутнасць адпаведнай базы для правядзення навуковай практыкі.

Дэкан факультэта журналістыкі **Р. В. Булацкі** расказаў аб падрыхтоўцы журналісцкіх кадраў ва універсітэце. За больш чым 20 год выпушчана звыш 1000 работнікаў друку, радыё, тэлебачання, выдавецтваў. У Беларусі няма ні адной шматтыражнай, раённай, абласной ці цэнтральнай газеты, дзе б ні працавалі выпускнікі-журналісты. Іх можна сустрэць у розных кутках Саюза.

Накапляючы вопыт падрыхтоўкі журналістаў, выкладчыкі кафедр адначасова распрацоўваюць пытанні гісторыі, тэорыі і практыкі друку, публіцыстыкі і стылістыкі. Вынікам гэтых намаганняў з'явіліся калектыўная праца «З гісторыі партыйна-савецкага друку Беларусі», кніга «Партызанскія былі», прысвечаная партызанскаму друку. Выйшлі ў свет кнігі дацэнтаў М. С. Зярніцкага, М. Я. Ціхоцкага, Е. Л. Бондаравай.

Цяпер аўтарскі калектыў рыхтуе зборнік па пытаннях беларускай публіцыстыкі, падрыхтаваны кнігі па тэорыі партыйна-савецкага друку Беларусі, аб публіцыстычным майстэрстве У. І. Леніна, аб творчай лабараторыі публіцыстаў ленінскай школы.

— І ўсё ж нас не пакідае пачуццё незадаволенасці, — гаворыць тав. Булацкі, — адчуванне таго, што кадры журналістаў трэба рыхтаваць лепш, даваць ім больш глыбокія веды, асабліва па грамадскіх і шэрагу спецыяльных дысцыплін.

Сучасны ўзровень савецкага друку, радыё і тэлебачання патрабуюць ад спецыялістаў гэтай сферы дзейнасці не толькі літаратурнага майстэрства, але і большай эрудыцыі. Каб выпускаць такіх спецыялістаў, факультэт павінен мець перш за ўсё, высокакваліфікаваныя кадры выкладчыкаў. Але пакуль што тут няма ні аднаго доктара навук, прафесара, а 50 працэнтаў выкладчыкаў не маюць вучоных ступеняў і званняў. І ў той жа час на стацыянарнае навучанне ў аспірантуры не прадугледжана ні аднаго месца для журналістаў.

Гаворачы аб важнай ролі грамадскіх навук па паляпшэнню падрыхтоўкі будучых работнікаў друку, радыё і тэлебачання, тав. Булацкі зазначыў, што на факультэце не чытаюць лекцыі па філасофіі, дыялектычнаму і гістарычнаму матэрыялізму, палітэканоміі такія вопытныя выкладчыкі, як В. І. Сцяпанаў, І. М. Лушчыцкі, А. Я. Бураўскі, І. Т. Рагоўскі.

Недастатковай з'яўляецца і эканамічная падрыхтоўка студэнтаў з-за адсутнасці высокакваліфікаваных выкладчыкаў. Па гэтай жа прычыне шэсць месяцаў не магла пачаць работу кафедра тэорыі і практыкі радыё і тэлебачання.

Яшчэ горшае становішча з матэрыяльнай базай факультэта. Тут няма ні адной адпаведнай лабараторыі. Вельмі неабходны друкарня з сучасным абсталяваннем, радыё- і тэлевізійная студыі, тэхнічныя сродкі па забяспячэнню навучальнага працэсу.

Р. В. Булацкі выказаў надзею, што агульнымі намаганнямі супрацоўнікаў факультэта журналістыкі, рэктарата універсітэта, парткома, Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, Праўлення Саюза журналістаў БССР будзе здзейснена рашэнне бюро ЦК КПБ, прынятае ў маі гэтага года аб паляпшэнні падрыхтоўкі журналісцкіх кадраў.

Дэкан фізічнага факультэта **І. П. Зяцькоў** сканцэнтраваў увагу на метадычнай рабоце кафедр з маладымі выкладчыкамі, на ролі камсамольскіх і грамадскіх арганізацый ва ўмацаванні дысцыпліны студэнтаў.

Часта камсамольскія сходы і актывы, вырашаючы многія пытанні студэнцкага жыцця, абыходзяць галоўнае — вучобу. Недастатковую ўвагу ўдзяляюць ёй і грамадскія арганізацыі. Добра вядома, што сяброўская крытыка, як і сяброўская дапамога, несумненна, мацнейшы рычаг павышэння паспяховасці.

Асобную ўвагу тав. Зяцькоў удзяліў выхаваўчай рабоце сярод студэнцтва, вызначыў эфектыўнасць асабістага прыкладу выкладчыка і яго глыбокай зацікаўленасці ў лёсе кожнага будучага спецыяліста. Востра было пастаўлена пытанне аб асабістай адказнасці студэнтаў за свае ўчынкі. Гэтае патрабаванне прагучала ў выступленнях многіх камуністаў, якія гаварылі аб неабходнасці прымянення адміністратыўных мер да тых, хто свядома ганьбуе нормамі камуністычнай маралі, не спыняецца перад злачынствамі.

Выступіўшы на сходзе сакратар Мінскага абкома партыі **А. Ц. Караткевіч** адзначыў паспяховую дзейнасць партыйнага камітэта за справаздачны перыяд у ідэалагічнай і выхаваўчай рабоце, у вырашэнні гаспадарчых пытанняў.

— Аднак, — гаворыць тав. Караткевіч, — партыйны камітэт недастаткова ўдзяляе ўвагу навуковай і метадычнай падрыхтоўцы маладых выкладчыкаў. Недастаткова добра арганізаваны падбор кандыдатаў у аспірантуру, у выніку чаго частка аспірантаў не паспявае ў тэрмін выканаць праграму і абараніць дысертацыі. Бывае часам, калі ў аспірантуру трапляюць выпадковыя людзі, якія не маюць дастатковай падрыхтоўкі.

Камуністы універсітэта ўсебакова абмеркавалі работу партыйнага камітэта, вызначылі шэраг праблем, якія патрабуюць неадкладнага вырашэння.

Выбран новы склад парткома і дэлегаты на XV партыйную канферэнцыю Ленінскага раёна. Партыйны камітэт універсітэта зноў узначальвае Т. Я. Дударава.

**А. НІКОЛЕНКА.**

**НА ЗДЫМКАХ: Дэлегацыя з Англіі ў БДУ (уверсе злева); ідзе эксперымент у лабараторыі фізікаў (справа).**
**Фота Д. ПРЭСА.**

## СКЛАД ПАРТЫЙНАГА КАМІТЭТА

1. Багданаў У. С.—намеснік сакратара парткома па палітыка-выхаваўчай рабоце.
2. Гахаў Ф. Д.—адказны за навуковую работу.
3. Дударава Т. Я.—сакратар парткома.
4. Жучкевіч В. А. — адказны за работу народнай дружыны.
5. Зяцькоў І. П.—адказны за вучэбную работу.
6. Лысенка С. А.—адказная за культурна-масавую работу.
7. Мазжухін І. А.—адказны за абаронна-спартыўную работу.
8. Нікулеў А. Ц.—намеснік сакратара па арганізацыйнай рабоце.
9. Прытыцкая Т. І.—адказная за работу з маладымі камуністамі.
10. Пасноў М. М.—адказны за шэфскую работу.
11. Пабока П. М.—адказны за друк.
12. Сеўчанка А. Н.—рэктар.
13. Сцяпанаў В. І.—адказны за навуковую работу.
14. Цішкевіч І. С.—немеснік сакратара парткома, старшыня групы народнага кантролю.
15. Цішчанка І. Р.—адказны за работу з замежнымі студэнтамі.
16. Ціва М. Д.—сакратар камітэта камсамола.
17. Шнеерсон Л. М.—адказны за партыйную асвету.

*Дні французскай культуры ў БССР*

# РАДАСНАЕ ЗНАЁМСТВА

У гэтыя дні многія гарады Беларусі гасцінна сустракалі прадстаўнікоў французскага народа. У Мінску тысячы гараджан з вялікай цікавасцю знаёмяцца з усім, што паказвае Францыя. Каля кінатэатраў выцягваюцца доўгія чэргі за білетамі на французскія фільмы, разгортваюцца гарачыя дыскусіі аб афармленні і зместу кніг на выстаўцы дзіцячай кнігі ў бібліятэцы імя У. І. Леніна; шматлікія аматары жывапісу змаглі прагледзець палотны выдатных французскіх майстроў.

Свята французскай культуры адзначыла і студэнцтва. Ва універсітэце адбыўся вялікі літаратурна-музычны вечар. Яго адкрыў старшыня праўлення Беларускага аддзялення Таварыства «СССР — Францыя» пісьменнік І. Мележ. З дакладам «Літаратурныя сувязі СССР і Францыі» выступіў загадчык кафедры зарубежнай літаратуры БДУ дацэнт Б. П. Міцкевіч. Прыцішаная зала уважліва слухала расказ аб адной з самых вядомых літаратур свету — французскай...

Зрабіўшы экскурс у гісторыю, Барыс Паўлавіч уважліва прасачыў нараджэнне і развіццё літаратуры Францыі ад ранняга сярэднявякоўя да нашых дзён. Перад слухачамі прайшлі многія буйнейшыя мастакі слова: Рабле, Карнель, Расін, Мальер, Вальтэр, Дзідро, Русо, Гюго, Бальзак, Флабэр, Мапасан, Заля, Ралан, Сціль, Арагон і іншыя. Цікавыя факты пазналі слухачы аб моцных сувязях паміж французскай і рускай літаратурамі, аб дружбе Тургенева і Флабэра, Ралана і Горкага, аб Луі Арагоне і Эльзе Трэале, якія называлі сябе прадстаўнікамі савецкай літаратуры ў Францыі. Захапляючыя водгукі Тургенева і Горкага аб французскай літаратуры, Ралана і Арагона аб рускай савецкай падцвярджаюць узаемаразуменне пісьменнікаў абедзвюх літаратур, той каштоўны ўклад, які ўнеслі яны ў развіццё сусветнай літаратуры. Расказваючы аб цяперашняй літаратурнай Францыі, Б. П. Міцкевіч гаварыў аб шматграннасці метадаў творчасці розных пісьменнікаў, аб мацнеючых літаратурных сувязях паміж нашымі краінамі.

Выступіўшыя затым беларускія паэты-перакладчыкі Ю. П. Гаўрук, і І. І. Семяжонаў прачыталі вершы французскіх паэтаў у перакладзе на беларускую мову. Цёпла сустрэлі прысутныя беларускую паэтэсу Эдзі Агняцвет, якая пазнаёміла іх са сваімі новымі перакладамі Беранжэ, і Элюара. Вершы Беранжэ прачытаў загадчык кафедры беларускай літаратуры прафесар М. Р. Ларчанка. Слухачы ўдзячна апладыравалі чытачам.

У другім аддзяленні вечара быў паказан літаратурна-музычны канцэрт студэнтаў універсітэта. Тры мовы — французская, руская і беларуская — перапляталіся на сцэне актавай залы. Праграма канцэрта была насычана самымі разнастайнымі выступленнямі. Вясёлы беларускі танец змяняўся французскай песняй, юмарыстычныя мініятуры — вершамі французскіх паэтаў, рускімі і беларускімі народнымі песнямі, і... зусім нечакана песня «Бывайце здаровы, жывіце багата» гучыць на французскай мове ў выкананні студэнтаў філфака. Бурна апладыруе зала і французскай песні «Плошча Пігаль», якую праспяваў А. Петрыкаў і рускай песні «Радзіма», вершам Беранжэ на французскай мове, якія прачытала Цыганок, і студэнцкім мініятурам.

Гэты вечар, які прайшоў цікава і ўзнёсла, з'яўляецца важным крокам ва ўмацаванні дружбы паміж савецкім і французскім народам.

**М. ЯЛОН.**

## ДА 50-ГОДДЗЯ БЕЛАРУСІ

# СТАРОНКІ ЦІКАВАГА СЯБРОЎСТВА

*Гэтыя пісьмы асаблівых каментарыяў не патрабуюць. Некалькі слоў аб прадгісторыі.*

*Напярэдадні 50-годдзя Вялікага Кастрычніка ў наш універсітэт прыйшло пісьмо з Масквы. Аўтар яго — Павел Мікалаевіч Пятрэнка, камсамолец 20-х гадоў, ветэран грамадзянскай і Айчыннай войнаў.*

*Камітэт камсамола і рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» даручылі свайму карэспандэнту, студэнту чацвёртага курса факультэта журналістыкі Анатолю Ярохіну весці перапіску з Паўлам Мікалаевічам Пятрэнкам.*

*Ніжэй мы друкуем некалькі пісьмаў.*



Паважаныя таварышы!

Калі вас зацікавіць фотаздымак 1929 года, на якім адлюстраван момант падпісання дагавору паміж студэнтамі Белдзяржуніверсітэта і кіеўскімі студэнтамі (ад кіяўлян дагавор падпісваюць Пятрэнка П., Матфес С., ад БДУ — Касцюковіч Р., сакратар камітэта камсамола, Чарнамордзік, член камітэта камсамола, і іншыя таварышы, прозвішчы якіх не памятаю), гэты здымак я вам дашлю. Вы здыміце копію, а арыгінал застанецца мне на памяць.

З павагай Пятрэнка.

4.06.67 г.

P. S. Наогул, гэта была вялікая ў студэнцкім жыцці падзея: абмеркаванне, зацвярджэнне і падпісанне дагавору.

Нас, кіяўлян, на вакзале Мінска вечарам чакаў вялікі атрад камсамольцаў са сцягамі і аркестрам.

Але... Мы выйшлі з вагона, сталі з боку, каб не перашкаджаць гэтай урачыстасці і каб пасля распытаць у людзей, як прайсці ва універсітэт.

Перачакаўшы мінут дзесяць, мы сталі пытаць на пероне, як трапіць у БДУ. Толькі тут сустракаючыя здагадаліся запытаць нас:

— Вы, выпадкова, не з Кіева?

— Так...

Аказалася, што гэта ўсё ж чакаюць нас, чаго мы, у сваю чаргу не чакалі.

Усёй калонай пайшлі ў інтэрнат.

□

Дарагі таварыш Пятрэнка!

Мы вельмі ўдзячны Вам за Ваша пісьмо. Безумоўна, такі рэдкі здымак нас вельмі цікавіць. Будзем удзячны, калі Вы дашляце яго нам... Мы рыхтуем матэрыял па гісторыі універсітэта і абавязкова выкарыстаем Вашы ўспаміны. Спадзяемся, што і надалей Вы будзеце падтрымліваць з намі сувязь.

З павагай, Анатоль Ярохін, студэнт факультэта журналістыкі.

P. S. Камітэт камсамола, грамадскія арганізацыі, рэктарат і партыйны камітэт універсітэта жадаюць Вам добрага здароўя і новых поспехаў!

12 чэрвеня 1967 г.

□

Паважаны Анатоль Паўлавіч!

Віншую Вас і Вашых таварышаў з 50-годдзем Кастрычніка. Жадаю вам вялікага шчасця і моцнага здароўя!

Прабачце, што затрымаўся з дасылкай фатаграфіі (хварэў, быў у ад'ездзе), днямі вышлю.

Яшчэ раз жадаю ўсяго найлепшага.

З павагай, Павел Мікалаевіч.

2.11.67 г.

□

Паважаны Анатоль Паўлавіч!

Выбраў час і пакапаўся ў сваіх архівах. Дасылаю здымак групы камсамольцаў БДУ, на якім Раман Касцюковіч падпісвае дагавор аб сацыялістычным спаборніцтве; побач — я, потым — Чарнамордзік, таксама з БДУ, кіяўлянін С. Матфес — справа; імёны астатніх, на жаль, не памятаю...

Няхай ветэраны ўспомняць. Мінск быў не такім і універсітэт таксама. Відавочна, толькі гарэць па-ранейшаму камсамольскія сэрцы.

Прымалі нашу кіеўскую дэлегацыю вельмі добра. Пачынаючы з вакзала і да развітання. Высылаю на памяць сваю фатаграфію 1959 года. 30 гадоў розніцы.

З павагай, Павел Мікалаевіч.

□

Гарачае прывітанне камсамольцам БДУ ад ветэрана грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў, ад старога камсамольца ў гонар 50-годдзя Вялікага Кастрычніка і найлепшыя пажаданні здароўя, вялікіх поспехаў у вучобе і чалавечага шчасця!

Ваш Павел Мікалаевіч.

3.11.67 г.

*Атрымаўшы фатаграфію, аб якой ідзе размова ў пісьмах, мы не змаглі яе змясціць толькі таму, што з-за даўнасці здымак немагчыма рэстаўрыраваць. А партрэт Паўла Мікалаевіча мы змяшчаем. На адвароце надпіс:*

*«Камсамольцам БДУ—1967 года на добрую памяць аб сустрэчы з камсамольцамі БДУ 1929 года.*

*Ваш Павел Мікалаевіч.*

*4.11.67 г.».*

□ □

**Друкуючы гэтыя пісьмы, мы спадзяемся, што на гэтым размова не скончыцца. Адклікнуцца тыя, хто прымаў асабісты ўдзел у падпісанні дагавору сацыялістычнага спаборніцтва паміж старэйшымі навучальнымі установамі двух гарадоў-братоў Мінска і Кіева. Студэнты навуковых гурткоў, гісторыкі, журналісты і іншыя, каго цікавіць гісторыя нашага універсітэта, распачнуць даследаванні і напішуць не адну гераічную старонку слаўных спраў нашай камсамольскай арганізацыі.**



## Дапамога старшых

На юрыдычным факультэце праводзіцца многа цікавых мерапрыемстваў па падрыхтоўцы да сесіі. Днямі адбылася сустрэча першакурснікаў з выпускнікамі — выдатнікамі вучобы. Апошнія падзяліліся сваім вопытам падрыхтоўкі да экзаменаў і адказалі на шматлікія пытанні сваіх малодшых сяброў.

К. САВЕЛІН.

## ПЕРАГОРТВАЮЧЫ ПАДШЫЎКІ ГАЗЕТ

**Дні французскай культуры ў БССР выклікалі вялікую цікавасць у нашым універсітэце. Выкладчыкі і студэнты актыўна ўдзельнічалі ва ўсіх мерапрыемствах, арганізаваных у Мінску Беларускім таварыствам дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі і праўленнем рэспубліканскага аддзялення таварыства «СССР—Францыя». Сотні юнакоў і дзяўчат наведалі выстаўку фотарэпрадукцый твораў вядомага французскага скульптара Жоржа Саландра, выстаўку французскай дзіцячай кнігі, выстаўку палотнаў беларускіх мастакоў, пабываўшых у Францыі... Вучоныя, універсітэцкія паэты і пісьменнікі выступілі перад працоўнымі сталіцы Беларусі з цікавымі гутаркамі аб культуры французскага народа.**

**У газеце «Советская Белоруссия» 10 снежня быў надрукаваны артыкул «Слова пра французскую літаратуру». Яго аўтарам з'яўляецца дацэнт нашага універсітэта член праўлення Беларускага аддзялення таварыства «СССР — Францыя» Б. Міцкевіч.**

**А напярэдадні, у суботу, у «Звяздзе» выступіў яшчэ адзін універсітэцкі аўтар — кандыдат філалагічных навук М. Цікоцкі са сваімі поглядамі на публіцыстыку.**

**«Два выстралы» — так назваў свой артыкул дацэнт юрыдычнага факультэта С. Курылёў, надрукаваны 9 снежня «Известиями». Аўтар узнімае перад юрыдычнай навукай і практыкай шэраг актуальных і пакуль што невырашаных пытанняў савецкага заканадаўства.**

**За мінулую нядзелю ў рэспубліканскіх маладзёжных газетах, «Мінскай праўдзе» і ў «Вячэрнім Мінску» выступілі іншыя універсітэцкія аўтары, у тым ліку студэнты факультэта журналістыкі. К. БУРАКОЎ.**

## У ЦЭНТРЫ СПРЭЧАК—АПОВЕСЦЬ

У мінулую пятніцу ў чытальнай зале бібліятэкі, куды сабраліся студэнты з розных факультэтаў, адбыўся цікавы дыспут па кнізе Р. Зярновай «Сонечны бок». Ініцыятары яго — кафедра рускай савецкай літаратуры і супрацоўнікі бібліятэкі. Адказныя С. Лысенка і А. Рукшын змаглі зацікавіць многіх студэнтаў. У спрэчках па аповесці выступілі не толькі філолагі і журналісты, але і фізікі, хімікі, біёлагі, матэматыкі.

С. БАРОДЗІН.



*На факультэце журналістыкі даўно працуе дацэнт Ефрасіння Леанідаўна Бондарава. Студэнты паважаюць яе як здольнага і патрабавальнага выкладчыка. Член Саюза кінематаграфістаў і член Саюза журналістаў СССР, яна мае вялікі вопыт практычнай дзейнасці і ахвотна перадае яго сваім вучням. Нядаўна Е. Л. Бондарава прымала экзамен у журналістаў - выпускнікоў і засталася задаволенай, што многія яе пажаданні, парады, тэарэтычныя лекцыі і гутаркі пайшлі на карысць будучым супрацоўнікам друку, радыё і тэлебачання.*

*На здымку: дацэнт кафедры тэорыі і практыкі савецкага друку Е. Л. Бондарава ў час экзаменаў.*

*Фота І. АСКІРКІ.*

